УДК 633.853.49 : 631.51

В. М. ШЛАПУНОЎ, Т. Н. ЛУКАШЭВІЧ, Л. І. ЧУХЛЕЙ, Т. М. ГРАБКО

АПРАЦОЎКА ГЛЕБЫ ПАД ПАЖНІЎНУЮ РЭДЗЬКУ АЛЕЙНУЮ

У Беларусі пажніўныя культуры вырошчваюцца пасля ранніх збожжавых — ячменю і азімага жыта. У сувязі з абмежаванасцю агракліматычных рэсурсаў у гэты перыяд раннія тэрміны сяўбы адыгрываюць важную ролю ў павышэнні ўраджайнасці пажніўных кармавых культур. Для забеспячэння аптымальных тэрмінаў сяўбы разам з арганізацыйнымі мерапрыемствамі вялікае значэнне мае правільны выбар спосабаў апрацоўкі глебы. У рэспубліцы апрацоўка глебы пад пажніўныя культуры зводзіцца да ўзворвання поля пасля ўборкі папярэднікаў, культывацыі з баранаваннем і прыкатваннем. Аднак нізкая прадукцыйнасць работ на ворыве — адна з прычын спазнення з сяўбой і скарачэння перыяду вегетацыі пажніўных культур.

Даследаванні, праведзеныя ў Польшчы і Румыніі, паказалі, што ўзворванне глебы пад пажніўныя пасевы можна замяніць фрэзераваннем

ці дыскаваннем [9, 10]. У Чэхаславакіі і Англіі даследчыкі вызначылі, што для рапсу, гарчыцы, капусты перспектыўная прамая сяўба (без апрацоўкі глебы), якая забяспечвае значнае скарачэнне затрат працы і атрыманне такіх жа ўраджаяў, як і пры агульнапрынятай агратэхніцы вырошчвання [7, 8].

Эфектыўнасць мінімальных апрацовак пад паўкосныя і пажніўныя пасевы пацвердзілі даследы, праведзеныя ў Саратаўскай вобласці, Валгаградскім СГІ, у Цэнтральна-чарназёмнай зоне РСФСР, на паўночным Каўказе [1—5].

Для вывучэння магчымасці замены ўзворвання пад пажніўныя культуры менш энергаёмістымі спосабамі апрацоўкі глебы з больш высокай прадукцыйнасцю ў 1984—1986 гг. былі праведзены даследаванні на эксперыментальнай базе «Жодзіна» Смалявіцкага раёна Мінскай вобласці. Глеба доследнага ўчастка дзярнова-падзолістая лёгкасуглінкавая, характарызуецца наступнымі паказчыкамі: гумус — 1,54—2,0%, pH_{KCl} 5,73—6,35, гідралітычная кіслотнасць — 1,17—2,06 мг-экв/100 г глебы, колькасць P_2O_5 — 18,5—27,7, K_2O — 12,2—18,8 мг/100 г глебы. Папярэднік пажніўнай рэдзькі алейнай — ячмень на зерне.

Фосфарныя (P_{60}) і калійныя (K_{90}) угнаенні для пажніўнай сяўбы ўносіліся ў «запас» пад папярэднік, азотныя (N_{90}) — пад перадпасяўную апрацоўку, а пры прамой сяўбе — па ржышчы. Асноўная апрацоўка глебы ўключала наступныя варыянты: 1) узворванне (на 20—22 см), 2) дыскаванне (на 10—12 см), 3) чызеляванне (на 15—16 см), 4) культывацыя (на 4—5 см), 5) прамая сяўба (без асноўнай і перадпасяўной апрацоўкі глебы).

Перадпасяўная апрацоўка пасля ўзворвання складалася з культывацыі з баранаваннем і прыкатваннем. На вар. 2—4 баранаванне выключалі. Для сяўбы на фоне ўзворвання выкарыстоўвалі сеялку СН-16 з анкернымі, на астатніх варыянтах — з дыскавымі сашнікамі. Норма высявання рэдзькі алейнай 3 млн шт. усходжага насення на 1 га. У доследах улічвалі палявую ўсходжасць насення і выжывальнасць раслін да ўборкі, вільготнасць глебы перад сяўбой і ў дынаміцы ў час вегетацыі, аб'ёмную масу глебы. Улік ураджаю рэдзькі алейнай праводзіўся шляхам узважвання зялёнай масы з усёй дзялянкі.

Пажніўная сяўба ў 1984 г. праводзілася 12 жніўня, у 1985 г.— 10 жніўня, у 1986 г.— 30 ліпеня, уборка ўраджаю — адпаведна 19, 15 і 20 кастрычніка. Працягласць даўсходавага перыяду рэдзькі алейнай залежала больш ад умоў увільгатнення, чым ад спосабаў апрацоўкі глебы. У 1984 г., калі вільготнасць глебы перад сяўбой на глыбіні 0—10 см складала 16,7—18,8%, у час поўных усходаў — 20,3—24,4%, усходы з'явіліся праз восем дзён пасля сяўбы (табл. 1). У 1986 г. у сувязі з неда-

Табліца 1. **Вільготнасць глебы ў пасевах пажніўнай рэдзькі алейнай у залежнасці ад спосабаў апрацоўкі глебы**

№ п.п.	Варыянт і спосабы апрацоўкі глебы	Глыбіня ўзяцця ўзораў, см	Пры сяўбе			У перыяд поўных усходаў			Пры ўборцы		
			1984 г.	1985 г.	1986 г.	1984 г.	1985 г.	1986 г.	1984 г.	1985 г.	1986 г.
1	Узворванне	0—10	17,3	15,5	9,9	22,2	17,6	7,1	27,2	21,7	18,1
		10—20	17,9	17,3	10,6	0	16,7	0	28	21,3	18,2
2	Дыскаванне	0—10	17,1	15,5	9,6	24,4	18,5	7,6	28,1	22,8	18,4
		10—20	17,8	15,1	10,7	0	17,5	0	26,5	21,6	18
3	Чызеляванне	0—10	16,9	16,1	9,1	22,8	17,4	6,6	26,3	22,4	17,9
		10—20	17,2	17,8	11,2	0	16	0	27	22,2	18,1
4	Культывацыя	0—10	19,5	16,9	9,5	24,1	17,1	6,1	26,8	22,7	17,9
		10—20	16,7	17,4	10,7	0	16,6	0	25,8	21,4	18,4
5	Прамая сяўба (без апрацоўкі)	0—10	18,8	17,6	10	20,3	16,5	7,6	22,3	21,8	17,9
		10—20	16,9	18,1	10,6	0	16	0	23,8	21,6	18,2